ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (1068) ● Серада, 6 лістапада 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

# СА СВЯТАМ, СЯБРЫ!

**Свята Кастрычніка — сапраўды ўсенародная ўрачыстасць. І таму з выключнай энергіяй і энтузіязмам адзначаюць савецкія людзі кожную гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.**

**Штогод 7 лістапада — гэта агляд поспехаў і дасягненняў, дэманстрацыя адзінства і згуртаванасці народа, гарачага імкнення рабочых, калгаснікаў, шматлікай арміі інтэлігенцыі памнажыць багацце і славу Радзімы.**

**У гэтыя дні краіна прымае рапарты аб ходзе выканання планаў вызначальнага года пяцігодкі, віншуе пераможцаў уборачнай страды, будаўнікоў, металургаў, шахцёраў, адзначае дасягненні прадстаўнікоў навукі, культуры, мастацтва.**

**У дзень свята на вуліцы і плошчы гарадоў і вёсак нашай краіны выйдуць мільёны людзей, прадстаўнікоў розных пакаленняў, каб прадэманстраваць вернасць ідэалам вялікага Леніна, адданасць роднай Камуністычнай партыі.**

**Па-святочнаму ўпрыгожана сталіца нашай рэспублікі — горад-герой Мінск. На кожным прадпрыемстве, у кожнай установе пануе прыўзняты настрой, абумоўлены добрасумленнай працай, яе плённымі вынікамі.**

**Свята прыйшло і ва універсітэцкія карпусы і інтэрнаты. Яго прыкметы — у свежых выпусках насценных газет, маляўнічых стэндах, цікавых выстаўках.**

**Калектыў буйнейшай у рэспубліцы вышэйшай навучальнай установы падышоў да 57-й гадавіны Вялікага Кастрычніка з выдатнымі вынікамі трэцяга, працоўнага семестра, шматлікімі падзякамі за дапамогу сельскім працаўнікам ва ўборцы ўраджаю, значнымі перамогамі студэнтаў ва ўсесаюзным конкурсе на лепшую навуковую работу, новымі дасягненнямі вучоных.**

**Гэта добрыя прыкметы, залог новых поспехаў і здабыткаў.**

**Са святам, сябры! Плёну ў працы, шчасця вам у жыцці!**



Падведзены вынікі агляду-конкурсу ВНУ краіны па арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў. Савет студэнцкага навуковага таварыства нашага універсітэта ўзнагароджан ганаровым дыпломам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ. Прыемна павіншаваць выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры мікрабіялогіі, гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і прарэктара БДУ, члена-карэспандэнта АН БССР, прафесара Леаніда Вікенцьевіча Валадзько, узнагароджаных ганаровымі дыпломамі Міністэрства і ЦК ВЛКСМ за поспехі, дасягнутыя ва ўсесаюзным конкурсе-аглядзе ВНУ краіны па лепшую арганізацыю навукова-даследчай работы студэнтаў. Узнагароды сведчаць аб вялікай рабоце кафедр, вучоных і выкладчыкаў універсітэта, якія прыклалі шмат намаганняў для развіцця навуковай студэнцкай творчасці.

# ВІНШУЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ

На ўсесаюзны конкурс 1973-1974 навучальнага года на лепшую работу па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках студэнтамі нашага універсітэта было прадстаўлена 34 работы (26 — у 1972-73 навучальным годзе). Як заўсёды, добра падрыхтаваліся да агляду біялагічны факультэт (4 работы), фізічны факультэт (6 работ), факультэт прыкладной матэматыкі (5 работ).

Гістарычны факультэт прадставіў 7 работ, філалагічны — 3, хімічны і матэматычны — па адной. Упершыню ўдзел у конкурсе прынялі студэнты юрыдычнага факультэта (7 работ).

І калі мы спадзяваліся на поспех біёлагаў, фізікаў і матэматыкаў, ведаючы, з якой увагай адносяцца дэканаты, выкладчыкі гэтых факультэтаў да студэнцкіх даследаванняў, то пераможны вынік удзелу ў конкурсе студэнтаў юрыдычнага факультэта быў прыемным сюрпрызам.

Медалі «За лепшую навуковую студэнцкую работу» заваявалі студэнтка V курса юрыдычнага факультэта Н. Ядзевіч, якая прадставіла работу «Раздзел паю і кватэр у ЖБК», і студэнт V курса матэматычнага факультэта Чан Дык Він («Аб адным класе задач спалучэння эліптычных сістэм»).

Дыпломамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ узнагароджаны навуковыя кіраўнікі лаўрэатаў конкурсу дэкан юрыдычнага факультэта, прафесар В. Ф. Чыгір і дацэнт ФПМ В. П. Карзюк.

Лаўрэатамі Усесаюзнага конкурсу сталі студэнты ФПМ В. Булатаў, Т. Калюжная і О. Навумовіч, студэнты біялагічнага факультэта Т. Злотнік і Д. Юнусава, студэнт фізічнага факультэта С. Гілеўскі. Яны таксама ўзнагароджаны дыпломамі.

Поспех лаўрэатаў па праву раздзяляюць іх навуковыя кіраўнікі; прафесар В. А. Ізох, прафесар Р. Ф. Габасаў, старшы навуковы супрацоўнік А. Ф. Былінскі, асістэнт М. М. Філімонаў, аспірант Я. І. Боўбель.

Зараз пачалася падрыхтоўка да новага ўсесаюзнага конкурсу, які завершыцца ў 1975 годзе. Савет СНТ БДУ спадзяецца, што ўсе факультэты і кафедры універсітэта прымуць у ім актыўны ўдзел, і жадае творчых поспехаў яго удзельнікам.

**Я. ЦІТКОЎ,**
**старшыня савета СНТ БДУ.**






# КАСТРЫЧНІК ПАМЯТНЫ

## РЭВАЛЮЦЫЯ ДАЛА МНЕ ЎСЁ

**Усё жыццё савецкіх людзей азорана яркім святлом Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Ей абавязана шчаслівым лёсам шматнацыянальная сям'я народаў-братоў, ад яе вытокаў зыходзіць велічны поступ камуністычнага будаўніцтва. Вялікі Кастрычнік — вялікі стваральнік.**

**— Не ведаю, які лёс напаткаў бы мяне, вясковую дзяўчыну, калі б не Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая адкрыла ўсёй савецкай моладзі дарогу ў навуку, — расказвае Любоў Іванаўна Фіглоўская, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры рускай савецкай літаратуры. — У ліку многіх юнакоў і дзяўчат, якія прагна імкнуліся да ведаў, мне, дачцы беднага селяніна, у 16 год пашчаслівілася закончыць Мсціслаўскае педагагічнае вучылішча. Я стала настаўніцай.**

**Камсамольскае жаданне падказала паехаць у глыб Палесся, туды, дзе некалі настаўнічаў Якуб Колас. Тут, у глухой вёсцы, што згубілася сярод топкіх балот і сініх бароў, пачынаўся мой самастойны працоўны шлях. Даводзілася не толькі весці заняткі ва ўсіх чатырох класах Капліцкай школы, але і змагацца разам з маімі сябрамі-камсамольцамі з забабонамі ў вёсцы, арганізоўваць драмгурток, расказваць пра новае жыццё, а вечарам, пры святле лучыны, вучыць пісьменнасці бацькоў сваіх вучняў. Хацелася данесці святло Кастрычніка ў кожную сялянскую хату.**

**А потым вясковая настаўніца скончыла дзве ВНУ, стала доктарам філалагічных навук, выхавала дастойных вучняў.**

**— Вельмі запомнілася мне святкаванне 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, — гаворыць Любоў Іванаўна. — Да гэтай даты мы падышлі з вялікімі поспехамі: вырасла наша кафедра рускай савецкай літаратуры, умацаваўся яе састаў. Дзесяць чалавек абаранілі доктарскія дысертацыі і цяпер плённа працуюць у навуцы.**

**Любоў Іванаўна Фіглоўская ўзнагароджана ордэнамі «Знак пашаны» і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Яна па праву гаворыць: «Рэвалюцыя дала мне ўсё».**

# СТАРОНКІ СЛАВЫ БАЯВОЙ

**МІНСК — ГОРАД-ГЕРОЙ**



**Раздзел «Старонкі славы баявой» вядзе ст. выкладчык кафедры гісторыі СССР гістарычнага факультэта Л. А. Міхайлоўскі.**

22 чэрвеня 1941 года Беларусь адна з першых прыняла на сябе ўдар нямецкіх агрэсараў і стала арэнай бязлітасных баёў. Ужо 23—24 чэрвеня вораг жорстка бамбардзіраваў Мінск. Горад быў ахоплен пажарам. Пачалася эвакуацыя.

Самаахвярна абаранялі воіны Савецкай Арміі сталіцу Беларускай ССР. Савецкія воіны пад Мінскам затрымалі праціўніка на трое сутак і нанеслі яму вялікі ўрон у жывой сіле і баявой тэхніцы. У баях ля Мінска, на Беразіне толькі адна 100-я дывізія пад камандаваннем генерала Русіянава знішчыла дзесяткі фашысцкіх танкаў, 4 палкі пяхоты, бранятанкавы полк і асобны матацыклетны батальён праціўніка.

28 чэрвеня вораг уварваўся ў Мінск. Але і на наступны дзень, 29 чэрвеня, у горадзе не спыняліся баі. Невялікі атрад савецкіх воінаў з дывізіі Русіянава працягваў бітву — знішчыў вялікую групу фашыстаў у раёне Чэрвеньскага рынка.

Гісторыя захавала нямала гераічных эпізодаў абароны Міншчыны ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.

К вечару 27 чэрвеня 1941 года на мосце каля Мінскай ЦЭЦ паявіліся першыя фашысцкія разведчыкі.

Горад ужо ляжаў у руінах, апусцелы. І раптам да маста накіраваўся савецкі танк, накрыты брызентам. Калі ён спыніўся, з-пад брызенту выскачыла група нашых байцоў і пачала мініраваць мост. Фашысты адкрылі агонь на мінёрах. Але танк зароў маторам і рвануўся наперад, каб прыкрыць іх. З ходу ён перавярнуў машыну з гітлераўцамі, другую падбіў з гарматы і прымяў гусеніцамі. Як палаючы факел, танк імчаўся наперад і хутка схаваўся з вачэй. А ля маста мінёры працягвалі бой. Механік-вадзіцель Д. І. Малько ў 1961 годзе ўзнагароджан за гэты подзвіг ордэнам Айчыннай вайны І ступені. У саставе экіпажа танка былі таксама камісар Мінскага ваеннага вучылішча Міхайлаў, старшыны Сочнікаў і Ярмольцаў.

Пачатак вайны склаўся для нашай краіны неспрыяльна, сілы былі вельмі няроўныя. Чырвоная Армія вымушана была адступаць, нягледзячы на яе гераічнае супраціўленне.

Акупіраваўшы нашу рэспубліку, фашысты пазбавілі беларускі народ дзяржаўнай самастойнасці, усіх палітычных правоў і свабод, заваяваных у выніку Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і перамогі сацыялізму. Але з першых дзён уварвання на беларускую зямлю нямецка-фашысцкія захопнікі натыкнуліся на масавае супраціўленне беларускага народа, якое прымала самыя разнастайныя формы.

З бясприкладнай мужнасцю і самаахвярнасцю змагаліся супраць гітлераўскіх захопнікаў падпольшчыкі і жыхары беларускай сталіцы.

Мінскі падпольны абком на чале з першым сакратаром В. І. Казловым пачаў дзейнічаць у першыя месяцы акупацыі. Члены абкома і спецыяльныя ўпаўнаважаныя накіраваліся ў розныя раёны для наладжвання падпольных арганізацый і партызанскіх атрадаў.

1100 дзён знаходзіўся Мінск пад уладай гітлераўцаў. Гэта самая цяжкая старонка ў шматвекавой гісторыі горада. Нямецкія фашысты ўстанавілі крывавы тэрарыстычны рэжым, ператварылі Мінск у горад «асобага прызначэння». У ім знаходзілася рэзідэнцыя ката беларускага народа гаўляйтэра Кубэ. У Мінску размясціліся галоўныя фашысцкія ўстановы, ваенныя праўленні і штабы арміі «Цэнтр». Пастаянны ваенны гарнізон налічваў да пяці тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

Нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі і ўзарвалі буйнейшыя прадпрыемствы. З бязлітаснай жорсткасцю яны знішчалі культурныя і навуковыя каштоўнасці беларускага народа, помнікі старажытнасці і архітэктуры; яны грамілі і грабілі культурныя ўстановы Мінска, тэхнікумы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэатры, клубы, музеі.

Велізарныя разбурэнні ў Мінску не былі выпадковымі. Фашысты не хавалі сваіх намераў ператварыць Беларусь у калонію, крыніцу сыравіны для прамысловасці Германіі.

Рабаванню і гвалтоўніцтвам было падвергнута таксама і насельніцтва акупіраванага Мінска.

У горадзе быў устаноўлен жорсткі акупацыйны рэжым. Загад ішоў за загадам. За невыкананне—расстрэл. Жыхарам Мінска забаранялася хадзіць па гораду з 17 гадзін вечара да 5 гадзін раніцы. За парушэнне гэтага правіла фашысты расстрэльвалі на месцы.

Але Мінск не апусцеў, як здавалася на першы погляд у пачатку акупацыі. Ён толькі затаіў дыханне. У ім мацней і гарачэй білася сэрца камуністаў і беспартыйных патрыётаў. Кіруючыся ўказаннямі партыі, камуністы і камсамольцы сталі аб'ядноўвацца ў невялікія падпольныя групы. Так узніклі група чыгуначнікаў, група супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў, група ў раёне Камароўкі, група выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага інстытута і іншыя.

У стварэнні падпольных груп і правядзенні палітычнай работы ў народзе актыўны ўдзел прымалі В. Амельянюк, І. Казінец, А. Каліноўскі, В. Жудро, Н. Осіпава, С. Зайцаў і іншыя патрыёты Савецкай Радзімы, верныя сыны Камуністычнай партыі і Ленінскага камсамола.

Гераічную старонку ў гісторыю самаахвярнай барацьбы з нямецкімі захопнікамі ўпісалі падпольшчыкі і жыхары беларускай сталіцы —Мінска.

За асаблівыя заслугі, стойкасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, удзельнікам мінскага падполля І. К. Кабушкіну, І. П. Казінцу, М. А. Кедышку, Е. В. Клумаву, В. С. Амельянюку пасмяротна прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Вялікая група актыўных удзельнікаў падполля ўзнагароджана ордэнамі і медалямі.

(Працяг будзе).

# ВІНШУЕМ!

Дарагія савецкія сябры — студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта!

Віншуем вас з 57-й гадавінай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Жадаем вялікіх поспехаў у вучобе і працы.

**Савет дружбы савецкіх і замежных студэнтаў БДУ.**

# У ГЭТЫЯ ДНІ

**Кабінет гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў арганізаваў для першакурснікаў матфака наведанне Дома-музея І з'езда РСДРП. Экскурсію правялі выкладчыкі кафедры Г. А. Калініна і Р. А. Малюковіч.**

* * *

**На гістарычным факультэце створан клуб інтэрнацыянальнай дружбы. Яго члены ўзялі шэфства над студэнтамі падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян. Пры клубе будуць працаваць лектарская група, канцэртная брыгада, прэс-цэнтр, экскурсійнае бюро. Студэнты-гісторыкі дапамогуць замежным сябрам у аваладанні рускай мовай, пазнаёмяць іх з выдатнымі месцамі нашай рэспублікі.**

**Прэзідэнтам інтэрклуба выбрана студэнтка III курса Г. Петрашкова, член ідэалагічнага сектара камсамольскага бюро гістфака.**

* * *

**Камітэт камсамола факультэта прыкладной матэматыкі правёў агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці першакурснікаў.**

* * *

**Свята Кастрычніка сустрэнуць у паходах па роднаму краю турысты універсітэта. Яны адправіліся на Блакітныя азёры Браслаўшчыны, у падарожжы па Бярэзінскаму запаведніку, Палессю, да ракі Пціч і Лепельскіх азёр, што на Віцебшчыне.**

# ПІСЬМЕННІКУ БАРАЦЬБІТУ

У актавай зале філфака адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны юбілею М. А. Астроўскага. Аб творчым шляху пісьменніка-барацьбіта, аб яго сябрах расказалі студэнты М. Ціцянкоў, А. Тарасюк, Г. Лабацэвіч, Н. Мацеціна.

У вечары прыняў удзел народны аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры БССР М. А. Лісіцына.

Прысутныя паглядзелі дакументальны фільм «Подзвіг».

Л. КАЛБАСКА.

# ПРАЦЯГВАЕМ ТРАДЫЦЫІ

Зразумела, калі людзям старэйшага пакалення свята, што наступае, дае штуршок для ўспамінаў, звяртае думкі да пражытага, то мы, прадстаўнікі малодшага пакалення, сустракаем гадавіну Кастрычніка з думкамі аб цяперашнім часе і, галоўнае, аб будучым. У будучыню, мне здаецца, была накіравана і Усесаюзная алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», завяршаючы этап якой праходзіў у Маскве напярэдадні 57-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Бо яна, па задуме арганізатараў, выяўляла падрыхтаванасць студэнтаў да будучай навуковай работы і для многіх удзельнікаў стала першым крокам у вялікую навуку.

Вядома, алімпіяда не можа стаць універсальным сродкам для рашэння такіх задач. Яе мэта ў тым, каб аднавіць хаця б асобныя бакі, асобныя моманты цяперашняга навуковага даследавання. Менавіта такі погляд на алімпіяду выказаў у сваім выступленні на закрыцці алімпіяды па матэматыцы акадэмік АН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы Андрэй Мікалаевіч Калмагораў.

У II, заключным туры алімпіяды ўдзельнічала 18 каманд: каманды Масквы, Ленінграда, дзве каманды РСФСР і па адной камандзе ад іншых саюзных рэспублік. І тое, што ў такім значным навуковым спаборніцтве моладзі нароўні прымалі ўдзел прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей, усіх куткоў нашай Радзімы, таксама гаворыць аб вялікіх заваяваннях рэвалюцыі.

Каманда беларускіх матэматыкаў выступіла ў Маскве даволі паспяхова, набраўшы самую большую колькасць ачкоў пасля каманд Масквы, Ленінграда, РСФСР (І) і Украіны. Такі вынік не быў нечаканасцю і сведчыць аб трывалых традыцыях беларускай матэматычнай школы.



**І. ВАЛІЧЭНКА, студэнт III курса матфака лаўрэат алімпіяды (III прэмія).**

# ВАЖНЫ ЭТАП

ТРЫ гады—гэта даволі вялікі тэрмін у жыцці студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі універсітэта. Што зроблена за гэты час, якія дасягнуты поспехі? Аб гэтым ішла цікавая гаворка на XXXI справаздачна - выбарнай канферэнцыі.

9 400 членаў прафсаюза ў нашай арганізацыі. Гэта вялікі атрад маладых змагароў за ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Аб гэтым гаварыў дакладчык, старшыня прафкома А. Жылінскі.

Ён падкрэсліў усё ўзрастаючую ролю студэнтаў у кіраванні прафсаюзнымі справамі. Выдзяленне пуцёвак у міжвузаўскі прафілакторый, аказанне матэрыяльнай дапамогі і многія іншыя пытанні вырашаюць самі студэнты.

У дакладзе былі адзначаны поспехі у палітыка-выхаваўчай рабоце. Экскурсіі, лекцыі, наведванне памятных мясцін і іншыя мерапрыемствы сталі традыцыйнымі. Але на гэтым участку прафсаюзнай работы ёсць і недахопы. Студэнцкія саветы інтэрнатаў № 5 і № 7 не ўдзяляюць неабходнай увагі масавым мерапрыемствам.

А. Жылінскі падрабязна спыніўся на рабоце жыллёва-бытавой камісіі. Яе члены арганізавалі вучобу актыву жылбыткамісій факультэтаў, пад пастаянным кантролем трымалі ход сацыялістычнага спаборніцтва за лепшы інтэрнат, пакой. І першае месца ў гэтым спаборніцтве займае па выніках мінулага навучальнага года інтэрнат № 1, другое месца — інтэрнат № 4 і трэцяе — інтэрнат № 6.

Ёсць і недахопы ў гэтай рабоце. Слабая ўвага аддаецца спаборніцтву ў інтэрнаце № 7, таму там здараюцца выпадкі парушэння дысцыпліны. Члены жыллёва-бытавой камісіі універсітэта не трымалі пастаяннай сувязі з актывамі факультэтаў.

Вялікае поле дзейнасці ў групы грамадскага кантролю. Галоўную ўвагу яна ўдзяляла рабоце сталовых і буфетаў. Больш 50 праверак зроблена групай.

На канферэнцыі былі заслуханы таксама справаздачы рэвізійнай камісіі (старшыня — Макась), старшыні праўлення клуба Герасіменкі.

Дэлегаты канферэнцыі актыўна абмяркоўвалі справаздачны даклад. Ролі грамадскіх арганізацый у камуністычным выхаванні моладзі прысвяціў сваё выступленне сакратар камітэта камсамола БДУ У. А. Навумовіч. Загадчыца паліклінікі БДУ М. І. Цырульнікава расказала аб медыцынскім абслугоўванні студэнтаў.

Справаздачна-выбарная канферэнцыя — важны этап у прафсаюзным жыцці. Падведзены не толькі вынікі зробленага, але і намечаны новыя планы.

Т. КУДРЫЦКАЯ.

□

**Будучыя фізікі шмат працуюць у лабараторыях. НА ЗДЫМКУ: другакурснікі Анатоль КІСЛЫ, Вольга КЛЮЕВА і Ала ЛЕМЯШЭЎСКАЯ на практычных занятках у лабараторыі электрычнасці.**

Фота **А. Цыгулёва.**

□



# ЛІСТАПАД

**7 лістапада**—57 год Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

**7 лістапада** —70 год з дня нараджэння (1904) Аалы Такамбаева, кіргізскага савецкага пісьменніка.

**10 лістапада** — Дзень Савецкай міліцыі.

**10 лістапада** — Сусветны Дзень моладзі.

**10 лістапада**— 80 год з дня нараджэння М. А. Руднева (1894—1918), героя грамадзянскай вайны.

**17 лістапада** 1970 года — упершыню ў гісторыі касманаўтыкі на Месяц дастаўлен савецкі аўтаматычны самаходны апарат, кіруемы з Зямлі,—«Лунаход-1».

**17 лістапада** — Міжнародны Дзень студэнтаў.

**17 лістапада** — 70 год з дня нараджэння Саламеі Нерыс (Бачынскайтэ-Бучэне) (1904—1945), літоўскай савецкай паэтэсы.

**19 лістапада** — Дзень Ракетных войск і артылерыі.

**20 лістапада** — 55 год з дня адкрыцця (1919) I кангрэса Камуністычнага інтэрнацыянала моладзі (КІМ).

**28 лістапада** 1820 г. — нарадзіўся Фрыдрых Энгельс.

**29 лістапада** 1945 г. — абвешчана Федэратыўная Народная Рэспубліка Югаславія (зараз Сацыялістычная Федэратыўная Рэспубліка Югаславія). Нацыянальнае свята Югаславіі.

АГЛЯД ДРУКУ

# АФАРМЛЕННЮ— ЯКАСЦЬ ЗМЕСТУ

НАСЦЕННАЯ газета ў жыцці факультэта... Магчыма, пра яе ролю асобна гаварыць не прыходзіцца. Зразумела, яна вельмі важная. Газета — і прапагандыст, і дарадчык, і крытык.

Зрабіў хтосьці адкрыццё — калі ласка, зазірні на старонку і ты ўбачыш імя вынаходцы; праславіўся добрым пачынам—таксама газета раскажа аб ім. Усё шматграннае жыццё знаходзіць сваё адлюстраванне ў газетным летапісе.

Месца для газеты фізфака «За навуку» выбрана зручнае, што дае магчымасць студэнтам своечасова знаёміцца з кожным новым выпускам. Але нельга сцвярджаць, што, безумоўна, усе карыстаюцца такой магчымасцю, бо газета не прываблівае сваім афармленнем, яна не надта выдзяляецца сярод афіцыйных дакументаў, што вісяць побач. Нават сам малюнак загалоўка не вызначаецца ні яркасцю, ні прыгажосцю.

Мноства рубрык, якія ў той жа час служаць і назвай матэрыялаў, не выратоўваюць газету. Прымітыўны, школьны метад групіроўкі матэрыялаў застаецца пануючым. Загалоўкі напісаны няярка і ўсе амаль зліваюцца, стаяць на адным узроўні.

А матэрыялы ж пад імі цікавыя.

Не новая тэма аб першакурсніках тут вырашаецца паспяхова. З нататкамі выступае выкладчык, першымі ўражаннямі аб факультэце дзеліцца студэнт («Парады першакурсніку», «У краіне ведаў»).

Захапляюць сваёй змястоўнасцю матэрыялы пад рубрыкай «Трэці працоўны». Лета зноў смяецца сваімі сонечнымі вачыма, адчуваеш рытм будаўнічых атрадаў, і жыццё іх паўстае ва ўсёй сваёй прыгажосці і шматбаковасці...

Пабываць за мяжой выпадае многім студэнтам фізфака. Супрацоўніцтва з Сафійскім у Балгарыі і Іенскім у ГДР універсітэтамі абумовіла паездкі студэнцкіх груп на азнаямленча-вытворчую практыку. Аб гэтых падарожжах расказваюць матэрыялы пад загалоўкам «Мы ў гасцях».

Ажыўляюць выпуск, наглядна адлюстроўваюць падзеі, пра якія расказвае газета, добрыя фотаздымкі.

Ёсць у газеце і гумар, і іронія.

Насуперак традыцыі добрых пажаданняў, адзначым галоўны недахоп: не ўказаны дата выпуску, парадкавы нумар, прозвішчы членаў рэдкалегіі.

І ўсё ж калі б да зместу ды яшчэ і добрае афармленне—атрымаўся б выдатны выпуск.

Мяркуем, што рэдкалегіі «За навуку» трэба клапаціцца аб афармленні газеты гэтак жа старанна, як і аб змесце.

**В. ХАРОШКА,**
**М. ХАРЫТОНЕНКА.**

НОВЫЯ КНІГІ

# АДКУЛЬ ПАЙШЛО...

Ці не даводзілася вам задумвацца, адкуль пайшлі назвы беларускіх гарадоў і вёсак, якая іх гісторыя, ці змяніліся яны, а, можа, дайшлі да нас з глыбокай старажытнасці?

Чаму менавіта так называюцца Будавесць і Віцебск, Гомель і Глушкі, Барысаў і Гродна і, канешне, Мінск? Даведацца аб гэтым можна, калі вы зазірнеце ў кнігу доктара геаграфічных навук, прафесара кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін геаграфічнага факультэта Вадзіма Андрэевіча Жучкевіча «Кароткі тапанімічны слоўнік Беларусі».*)

Кніга ўтрымлівае вялікі фактычны матэрыял і, па словах аўтара, з'яўляецца спробай даць сістэматызаваную характарыстыку даных тапанімічных даследаванняў.

Чытач даведваецца пра напрамкі тапанімічных пошукаў і найбольш тыповыя памылкі пры гэтым, знаёміцца з метадамі работы самога даследчыка і з цікавасцю адшуквае тлумачэнні знаёмых і незнаёмых яму назваў, робіць своеасаблівае падарожжа па самых розных куточках роднай рэспублікі.

Вельмі важны і такі бок: слоўнік уносіць пэўны ўклад у вельмі складанае пытанне правапісу геаграфічных назваў.

Кніга прызначана для географаў, гісторыкаў, мовазнаўцаў, краязнаўцаў і ўсіх тых, хто цікавіцца назвамі геаграфічных аб'ектаў БССР.

*) В. А. Жучкевіч. Кароткі тапанімічны слоўнік Беларусі. Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Мінск, 1974.



**У агульнауніверсітэцкім кросе, які праходзіў па праграме спартакіяды, прысвечанай 30-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй, прынялі ўдзел 2.856 чалавек. Каля 500 удзельнікаў выканалі разрадныя нарматывы, амаль 1.800 — нормы на значок ГПА па кросу.**

**Першае месца заваявалі спартсмены журфака, на другім месцы — матэматыкі, на трэцім — біёлагі.**

**Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.**





# ІДЗЕ ПАДПІСКА

У гэтым годзе на нашым факультэце больш арганізавана ідзе падпіска на газеты і часопісы. Аб гэтым сведчаць наступныя лічбы. Калі ў мінулым годзе да 23 кастрычніка толькі камуністы і камсамольцы падпісаліся на 90 экземпляраў газеты «Правда», на 80 іншых партыйных выданняў, на 62 «Веснікі БДУ», то ў гэтым годзе на 28 кастрычніка ўжо выпісана 168 экземпляраў газеты «Правда», 150 іншых партыйных выданняў, 167 экземпляраў «Весніка БДУ» і г. д. А трэба яшчэ ўлічыць, што студэнты некалькіх курсаў прыступілі да вучобы пасля сельскагаспадарчых работ, чацвёртакурснікі толькі вярнуліся з вытворчай практыкі. Падпіска працягваецца.

У мінулым годзе наш факультэт па колькасці выпісаных выданняў заняў першае месца ва універсітэце. Гэта гаворыць аб тым, што калектыў, партыйная і грамадскія арганізацыі сур'ёзна адносяцца да такога адказнага палітычнага мерапрыемства, як падпіска. Аднак нельга сказаць, што ў нас усе магчымасці вычарпаны. Мы маглі б падпісную кампанію завяршыць хутчэй і лепш, каб усе парторгі і камсоргі курсаў і груп праявілі належную ўвагу і ініцыятыву, назіралі б за ходам падпіскі і своечасова інфарміравалі адказнага і партбюро.

Недастаткова ўвагі пытанням падпіскі ўдзяляюць некаторыя куратары, а таксама камітэт камсамола. Гэтым можна растлумачыць не зусім добрае становішча з падпіскай сярод камсамольцаў IV і V курсаў дзённага навучання.

Нягледзячы на гэтыя непаладкі, мы маем падставу меркаваць, што падпіска ў нас завершыцца паспяхова і мы з добрымі вынікамі сустрэнем свята Кастрычніка.

**Э. КАЛІНІНА,**
**член партбюро юрфака.**

## ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК




ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК

**У першакурсніка і пяцікурсніка шмат агульнага — абодва не ведаюць, што іх чакае наперадзе.**

✦

**— Не, не святыя гаршкі лепяць, — сказаў жыхар інтэрната, збіраючы чарапкі вазонніка.**

✦

**«Хвасціст» — від эгаіста: усё ведае (па яго словах), але не хоча дзяліцца сваімі ведамі з выкладчыкам.**

✦

**На экзаменах эксперыментаваў — кожны раз хаваў шпаргалку ў новае месца.**

✦

**У асартыменце буфета было: пячэнне, мінеральная вада і мыла для мыцця рук перад ежай.**

✦

**Перад экзаменам па логіцы мыўся і клаў пятак пад левую руку.**




**ПІСЬМО**

Малады чалавек піша пісьмо каханай дзяўчыне: «Дарагая мая! Дзеля цябе я гатоў пераплысці акіян. Скокнуў бы, не разважаючы, у бездань. Дайшоў бы да цябе, нягледзячы ні на якія цяжкасці і перашкоды.

PS. Прыйду ў нядзелю, калі не будзе дажджу».

### «ПАРАДЫ» ПЕРШАКУРСНІКУ

Будзь вечна маладым, але не заставайся вечна зялёным.

Навучыся плаваць. Нават у вадзе.

Не дазваляй дрэнным людзям падманваць сябе: навокал столькі добрых!

Не бойся памылак. Магчыма, адна з іх прывядзе цябе, як і Калумба, да адкрыцця Амерыкі.

Не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць пасьлязаўтра.

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар. **Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА**

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 11481 Заказ № 1474.